Источник: "Беларуская думка" - № 7, 2012-07-19



# У атмасферы строгай сакрэтнасці

## Неафіцыйныя польска-савецкія перагаворы ў Белавежы і Мікашэвічах (ліпень – снежань 1919 года)



Вольга БАРОЎСКАЯ, аспірант

Навуковы кіраўнік – ЛІТВІН Аляксей Міхайлавіч, доктар гістарычных навук, прафесар

**Перагаворны працэс стаў неад'емнай часткай ваеннага канфлікту паміж Польшчай і РСФСР у 1919–1920 гадах. Сустрэчы ў Белавежы і Мікашэвічах сталі пачатковым этапам на шляху мірнага вырашэння спрэчных пытанняў паміж бакамі, аднак з-за знешніх і ўнутраных абставін яны праводзіліся ў неафіцыйным (тайным) фармаце. Беларуская праблематыка на перагаворах не была дакладна акрэслена, аднак адназначна прысутнічала сярод пытанняў, якія разглядаліся прадстаўнікамі польскай і савецкай дэлегацый.**

Асноўны змест і вынікі сустрэч у Белавежы і Мікашэвічах былі прадвызначаны ходам Грамадзянскай вайны ў Расіі, адносінамі краін Антанты і ЗША да польскай і рускай праблем, ходам польска-савецкай вайны 1919–1920 гадоў. Польска-савецкае збліжэнне праз вядзенне неафіцыйных (тайных) перагавораў у ліпені, кастрычніку – снежні 1919 года было выклікана непасрэднымі поспехамі «белых» войскаў на Усходнім (май – чэрвень 1919 года) і Паўднёвым (жнівень – кастрычнік 1919 года) франтах Грамадзянскай вайны.

Незацікаўленасць кіраўнікоў антыбальшавіцкіх сіл у стварэнні самастойнай польскай дзяржавы выклікала імкненне польскага кіраўніцтва да заключэння часовага перамір'я на Заходнім фронце, каб такім чынам змяніць раўнавагу сіл на адзначаных франтах на карысць Савецкай Расіі. Арганізацыя польска-савецкага дыялога адбывалася ва ўмовах павышанай сакрэтнасці з-за жадання польскага кіраўніцтва захаваць у тайне ад краін Антанты і ЗША сам факт вядзення пэўных палітычных перагавораў. Неафіцыйны (тайны) характар місіі Ю. Мархлеўскага падкрэсліваў важнасць пытанняў, якія абмяркоўваліся падчас сустрэч. Уключэнне пытанняў гуманітарнага кірунку ў спіс праблематыкі служыла толькі прыкрыццём, своеасаблівай шырмай для абмеркавання палітычных праблем.

Выбар польскім кіраўніцтвам ваеннага шляху вырашэння існуючых тэрытарыяльных спрэчак паміж бакамі прывёў да заняцця польскімі войскамі значнай часткі тэрыторыі Беларусі. На пачатак чэрвеня 1919 года лінія фронту выглядала наступным чынам: Шаркаўшчына – Варапаева – воз. Нарач – ст. Залессе – Валожын – Івянец – Налібакі – Калядзіна – Клецк – Ганцавічы – рэкі Ясельда і Прыпяць *[1, с. 19]*. Неаднаразовыя прапановы РСФСР і Літоўска-Беларускай ССР аб мірным вырашэнні спрэчных пытанняў не прымаліся ў разлік польскім бокам.

Непасрэднай прычынай мірных захадаў польскага і савецкага бакоў стала рашэнне Савета чатырох Парыжскай мірнай канферэнцыі 26 мая 1919 года аб прызнанні ўрада А. Калчака, паводле якога ўсе спрэчныя тэрытарыяльныя пытанні паміж Польшчай і Расіяй павінны былі вырашацца праз трацейскі суд Лігі Нацый. Кіраўнік польскай дэлегацыі на Парыжскай мірнай канферэнцыі І. Падарэўскі ў адказ на гэтыя

### ПРА АЎТАРА

БАРОЎСКАЯ Вольга Мікалаеўна.

Нарадзілася ў Мінску. У 2010 годзе скончыла гістарычны факультэт, магістратуру Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. З 2010 года працуе архівістам першай катэгорыі ў Беларускім дзяржаўным архіве навукова-тэхнічнай дакументацыі.

Аспірант ДНУ «Інстытут гісторыі» НАН Беларусі.

Сфера навуковых інтарэсаў: праблематыка польска-савецкай вайны 1919–1920 гадоў, польска-савецкія перагаворы і іх уплыў на гістарычнае развіццё беларускіх земляў.

дзеянні краін Антанты заявіў, што «пад уплывам гэтага рашэння Польшча вымушана будзе разглядаць выгадныя ўмовы міру, прапанаваныя савецкім кіраўніцтвам» *[2, с. 284–285]*. Гэта падштурхнула польскае кіраўніцтва прыняць прапанову Ю. Мархлеўскага па вядзенні мірных перагавораў з Савецкай Расіяй і выступіць з ініцыятывай арганізацыі спецыяльнай сустрэчы польскага і савецкага дэлегатаў. У айчыннай гістарыяграфіі распаўсюджана меркаванне, што непасрэдным ініцыятарам пачатку перагавораў у Белавежы з'яўляўся савецкі бок *[3, с. 108–109]*, што не зусім адпавядае рэчаіснасці. Мархлеўскі не меў афіцыйна пацверджаных паўнамоцтваў з боку кіруючых структур РСФСР, вёў перагаворы з польскімі палітычнымі дзеячамі як прыватная асоба.



Ю. Мархлеўскі

Паводле сцверджання Ю. Мархлеўскага, у сярэдзіне ліпеня 1919 года адбылася яго сустрэча з Ю. Пілсудскім, падчас якой ішло абмеркаванне асноўных умоў плануемых перагавораў і было вырашана, што місія Мархлеўскага павінна мець неафіцыйны характар. Пасля гэтага, 18 чэрвеня 1919 года, Мархлеўскі быў адкамандзіраваны, у суправаджэнні спецыяльна прызначанага афіцэра, для беспярашкоднага пераходу лініі фронту *[4, с. 33–35]*.

Ю. Мархлеўскі прыехаў у Маскву 22 чэрвеня 1919 года. Савецкі ўрад падтрымаў яго ініцыятыву і 30 чэрвеня 1919 года рашэннем ЦК РКП(б) даручыў прадоўжыць працу ў гэтым напрамку «з місіяй пасрэдніцтва па ўзнаўленні мірных перагавораў паміж Польшчай і Савецкай Расіяй, для вырашэння спрэчных пытанняў паміж бакамі» *[5, S. 48–50]*. Згодна з праектам калегіі Народнага камісарыята замежных спраў РСФСР ад 27 чэрвеня 1919 года, дапоўненага падчас пасяджэння ЦВК КРПП 9 ліпеня 1919 года ў Мінску, на якім прысутнічалі прадстаўнікі кіраўніцтва Літ.-Бел. ССР (К. Цыхоўскі), дзеячы РВС Заходняга фронту (І. Уншліхт, А. Славінскі), а таксама Ю. Мархлеўскі *[5, S. 54–55, 58–61]*, перагаворы павінны былі праходзіць у два этапы: афіцыйныя перагаворы адносна вырашэння справы ваеннапалонных, заложнікаў, бежанцаў («раўназначны абмен польскіх заложнікаў на членаў КП ЛіБ, узятых у палон з лютага па чэрвень 1919 года польскімі войскамі»), неафіцыйныя (тайныя) перагаворы па пытанні заключэння перамір'я паміж бакамі. Прадугледжваліся значныя тэрытарыяльныя ўступкі польскаму боку – «перадача Мінска за абяцанне Польшчы не рухаць свае войскі далей на захад, пры ўмове двухбаковага вызвалення літоўскіх зямель з мэтай правядзення на гэтай тэрыторыі плебісцыту. Галасаванне ўсяго літоўскага насельніцтва з 18 гадоў павінна было вырашыць будучыню гэтых зямель. Спрэчныя тэрытарыяльныя пытанні паміж Польшчай і Літвой, Літвой і Беларуссю павінны быць разгледжаны на асобных плебісцытах» *[5, S. 74–75]*. Пасля галасавання кіраванне тэрыторыяй Літвы перадавалася польска-літоўскай камісіі.

Тэрыторыя Беларусі, такім чынам, заставалася падзеленай паміж польскім і савецкім бокам. Савецкае кіраўніцтва падчас перагавораў не планавала разглядаць пытанне будучыні беларускіх зямель, паказвала сваю незацікаўленасць па гэтай праблеме. Ідэя правядзення плебісцыту не распаўсюджвалася на тэрыторыю Беларусі і абмяжоўвалася выключна літоўскім абшарам. Неспрыяльнае для Чырвонай арміі ваенна-аператыўнае становішча прымушала савецкі бок да выбару «меншага зла», якое заключалася ва ўсталяванні часовага перамір'я на Заходнім фронце нават шляхам адмаўлення ад значнай часткі беларускіх зямель («межы, далёка высунутыя на ўсход»).

Кіраўнік савецкай дэлегацыі, як гэта бачна са зместу яго лістоў да жонкі Браніславы, разлічваў, што будзе прыняты разам са сваёй місіяй у Варшаве і пасля хуткага папярэдняга абмеркавання (прыкладна праз 4–6 тыдняў) даб'ецца пераходу да афіцыйных палітычных перагавораў *[5, S. 54–55]*. Разлікі Ю. Мархлеўскага абапіраліся на «пэўныя змены ў тыле»: магчыма, меліся на ўвазе змены, якія павінны былі адбыцца ў агуль-

ным ходзе Грамадзянскай вайны, а менавіта на Усходнім фронце, дзе ішла барацьба з войскамі А. Калчака.

Пераход савецкай дэлегацыі праз лінію фронту суправаджаўся пэўнымі цяжкасцямі. Нявызначанасць з месцам і часам пераходу, доўгае чаканне польскага парламенцёра, непрадказальнасць польскіх дзеянняў выклікалі незадаволенасць у кіраўніка савецкай дэлегацыі, які нарэшце (19 ліпеня 1919 года) з завязанымі вачыма быў дастаўлены ў Баранавічы *[5, S. 72–73]*, дзе 20–21 ліпеня 1919 года адбылася яго сустрэча з Ю. Асмалоўскім.

Змест сустрэчы ўзнавіць складана. Мархлеўскі ў сваім «Дзённіку» ўзгадвае аб перагаворах адносна заложнікаў, ваеннапалонных, бежанцаў *[5, S. 76]*. Ю. Асмалоўскі, другі непасрэдны ўдзельнік сустрэчы, наогул абыходзіць у сваіх успамінах гэтае пытанне *[6, S. 37]*. М. Касакоўскі, спасылаючыся на надзвычайную сакрэтнасць, апускае падрабязнасці сустрэчы *[5, S. 79]*. Адразу ўзнікае пытанне: ці магла падпадаць пад катэгорыю надзвычайнай сакрэтнасці праблематыка заложнікаў, бежанцаў, інтэрніраваных асоб? Адназначна не – падчас сустрэчы ў Баранавічах абмяркоўваліся больш важныя пытанні.

Відаць, на наш погляд, адным з іх магло быць пытанне арганізацыі плебісцыту на літоўска-беларуска-ўкраінскім абшары. Так, яшчэ падчас спецыяльнай місіі А. Вянцкоўскага ў сакавіку – красавіку 1919 года ў Маскве польскім бокам была выказана прапанова (у лісце Цэнтральнага рабочага камітэта ППС да ЦК РКП(б) аб «усталяванні мяжы на аснове самавызначэння насельніцтва спрэчных тэрыторый шляхам поўнага вываду пабочных войскаў і правядзення галасавання ва ўмовах поўнай свабоды» *[7, S. 127–128]*. Аднак тады кампраміс не быў дасягнуты. У канцы чэрвеня 1919 года савецкае кіраўніцтва ў асобе У. Леніна ў інструкцыі Ю. Мархлеўскаму зноў закранула пытанне правядзення плебісцыту на беларускіх землях і рэкамендавала рэзка выступаць супраць гэтага мерапрыемства *[6, S. 38]*. Ужо напярэдадні ад'езду Ю. Асмалоўскага з Варшавы ў Баранавічы (18 ліпеня 1919 года), на пасяджэнні камісіі Канстытуцыйнага сейма было разгледжана пытанне арганізацыі «ўсеагульных, роўных, тайных, прапарцыянальных выбараў сярод мясцовага насельніцтва на ўсходніх землях для выяўлення іх адносін да Польшчы», але рашэнне не было прынята *[5, S. 78]*. Пытанне правядзення плебісцыту на літоўска-беларуска-ўкраінскім абшары неаднаразова ўздымалася як савецкім, так і польскім кіраўніцтвам і мела ўсе шансы быць разгледжаным падчас дыялога Ю. Асмалоўскі – Ю. Мархлеўскі. Аднак недахоп інфармацыі ў крыніцах аб польска-савецкай сустрэчы ў Баранавічах не дае магчымасці сцвярджаць гэта адназначна.

Аналіз успамінаў Мархлеўскага прыводзіць да высновы аб наўмыснасці затрымкі



Поезд з бежанцамі

савецкага дэлегата ў Баранавічах. З боку Варшавы працяглы час не паступала згода на прыняцце савецкага дэлегата, ды і А. Вянцкоўскі (як прадстаўнік МЗС Польшчы) затрымліваўся ў дарозе з-за «крушэння цягніка». Магчыма, меў месца спецыяльна абдуманы план польскага кіраўніцтва аб зацягванні часу перамоў (ажно на 12 дзён) па прычыне нявызначанасці ваенна-аператыўнага становішча на Усходнім фронце Грамадзянскай вайны, дзе ўжо ў канцы ліпеня 1919 года войскі А. Калчака былі разгромлены і вымушаны былі адысці на 300 кіламетраў *[8, с. 149]*. Першапачатковы план Польшчы распачаць мірныя перагаворы з Савецкай Расіяй з мэтай заключэння часовага перамір'я на Заходнім фронце, каб такім чынам дапамагчы савецкаму боку разграміць войскі Калчака на Усходнім фронце, быў зменены на план перагавораў па пытанні заложнікаў, ваеннапалонных, бежанцаў і на працяг ваеннага наступлення.

Такім чынам, адназначна можна сцвярджаць: гэта пытанне было адным з тых, што абмяркоўваліся бакамі падчас сустрэчы ў Баранавічах. Але з-за складанасцей тэхнічнага характару (адсутнасць тэлеграфнай сувязі з Варшавай) перагаворы працягваліся ў Белавежы. З 22 па 30 ліпеня 1919 года праходзіла сустрэча Польскага і Расійскага таварыстваў Чырвонага Крыжа. Польскі бок быў прадстаўлены А.Вянцкоўскім (22–30 ліпеня 1919 года) і М. Касакоўскім (29–30 ліпеня 1919 года), савецкі – Ю. Мархлеўскім.

Пытанні, што абмяркоўваліся падчас гэтай сустрэчы, можна падзяліць на два кірункі: гуманітарны і палітычны. Адносна гуманітарных пытанняў савецкі бок прапаноўваў адмовіцца ад практыкі выкарыстання заложніцтва ў далейшых узаемаадносінах паміж бакамі; канчаткова вырашыць пытанне ваеннапалонных шляхам раўназначнага абмену; ажыццявіць двухбаковае прызнанне правоў таварыстваў Чырвонага Крыжа. Па пытаннях палітычнага характару праз Мархлеўскага было паведамлена аб магчымасці пайсці на тэрытарыяльныя ўступкі і замацаваць за польскім бокам тэрыторыі, занятыя яго войскамі *[5, S. 80–81]*. Гэтыя прапановы паведамілі віцэ-міністру замежных спраў Польшчы М. Скрыньскаму падчас перапынку ў перагаворах у Белавежы (23–29 ліпеня 1919 года), калі члены польскай дэлегацыі ад'ехалі ў Варшаву, праз кіраўніка польскай дэлегацыі А. Вянцкоўскага *[5, S. 92–93]*.

У выніку было вырашана перанесці разгляд гэтых пытанняў на асобна арганізаваную канферэнцыю, а час і месца яе склікання паведаміць па радыё. Астатняя частка сустрэчы звялася да вызначэння ўмоў будучай канферэнцыі: падчас яе праявіліся разыходжанні паміж бакамі адносна вызначэння паняцця заложніцтва. Польскі бок не прызнаваў факт выкарыстання адпаведнай практыкі, таму для яго пытанне адмаўлення ад заложніцтва як з'явы ў будучым было неактуальным. У адказ Мархлеўскі, каб не ўскладняць справу мірнага ўрэгулявання спрэчнымі момантамі, прыняў польскую формулу аднабаковай адказнасці за практыку заложніцтва. У далейшым польскія прадстаўнікі выкарыстоўвалі гэтую ўступку як інструмент палітычнага ўплыву на партнёра, не прызнаючы факт выкарыстання адзначанай практыкі польскім бокам. Абмеркаванне пытання часовага перамір'я і ўсталявання дэмаркацыйнай лініі польскі бок успрыняў негатыўна, знайсці кампраміс па гэтай праблеме было немагчыма з-за намераў польскага камандавання працягваць наступальныя дзеянні. Польская дэлегацыя адмовілася ад афіцыйных перагавораў адносна ўсталявання дэмаркацыйнай лініі і прапанавала весці іх толькі па справах Чырвонага Крыжа падчас наступнай сустрэчы, дамоўленасць аб арганізацыі якой была дасягнута.

Такім чынам, перамовы ў Баранавічах і Белавежы ў ліпені 1919 года з'яўляліся падрыхтоўчым этапам да плануемых перагавораў у Мікашэвічах і прадэманстравалі магчымасць атрымання тэрытарыяльных уступак ад савецкага кіраўніцтва для дасягнення паразумення паміж бакамі.

Пасля ад'езду абедзвюх дэлегацый савецкім і польскім бакамі пачалася падрыхтоўка да чарговай сустрэчы. 12 жніўня 1919 года была накіравана нота



P R O T O K U Ł

105-go posiedzenia Rady Ministrów Rzeczypospolitej Polskiej 318

w dniu 26 sierpnia 1919 roku.

Przewodniczy P.Prezydent Ministrów Ignacy Paderewski

O b e c n i :

| | |
|---|---|
| Minister Spraw Wewnętrznych | p.Stanisław Wojciechowski |
| " Skarbu | p.Dr.Leon Biliński |
| " Sztuki i Kultury | p.Zenon Przesmycki |
| " Przemysłu i Handlu | p.Ignacy Szczeniowski |
| " Robót Publicznych | p.Tadeusz Jasionowski |
| " Poczt i Telegrafów | p.Hubert Linde |
| " Zdrowia Publicznego | p.Dr.Tomasz Janiszewski |
| Kierownik Min.Kolei Żelaznych | p.Juljan Eberhardt |
| Podsekretarz Stanu Prezydjum Rady Ministrów | p.Dr.Władysław Wróblewski |
| Wiceminister Spraw Wojskowych | p.gen.ppor. Stefan Majewski |
| Podsekretarz Stanu Min.Rolnictwa i D.P. | p.Zygmunt Chmielewski |
| " " " Sprawiedliwości | p.Eugenjusz Śmiarowski |
| " " " Aprowizacji | p.Oskar Sobański |
| " " " Pracy i O.S. | p.Aleksander Prystor |
| Prezes Prokuratorji Generalnej | p.Stanisław Bukowiecki |
| Wiceprezes Prokuratorji Generalnej | p.Dr.Jan Waygart |
| Szef Sekcji Min.Spraw Zagranicznych | p.Karol Bertoni |
| " " " W.R.i O.P. | p.Tadeusz Łopuszański |
| " " Prezydjum Rady Ministrów | p.Edward Lechowicz |
| Protokułuje: | p.Dr.Bronisław Bełczyński |

Początek posiedzenia o godz.6 m.15 po południu.

1. Wobec niezgłoszenia przez żadnego z pp.Ministrów sprzeciwu przeciw protokułowi 104-go posiedzenia Rady Ministrów w dniu 1 sierpnia b.r. – uznano go za przyjęty.

2. P.Prezydent Ministrów komunikuje na podstawie informacji, otrzymanych od p.posła Rymara, że byłoby bardzo wskazane, aby do Zagłębia Dąbrowskiego wysłać Delegata Rządu, któryby reprezentował go wobec bawiących tam z powodu wydarzeń na Górnym Śląsku misji koalicyjnych, przyczem najodpowiedniejszym na to stanowisko byłby wyższy wojskowy. Sprawę tę przekazano do załatwienia Min.Spraw Wojskowych.

W związku z tem p.Minister Janiszewski porusza konieczność skoordynowania działalności delegatów poszczególnych Ministerstw, wysłanych do Zagłę-



– 5 – 320

ulegały zmianie.

15. P.Minister Biliński referuje wniosek Min.Skarbu w sprawie wstrzymania wypłaty drugiej połowy 13-ej pensji pracownikom państwowym. P.Podsekretarz Stanu Śmiarowski podnosi, że odmówienie tej wypłaty mogłoby wśród pracowników państwowych wywołać znaczne rozgoryczenie, gdyż napewno oni na nią liczyli. Wobec tego p.Minister Biliński prosi o odroczenie decyzji w tej mierze do następnego posiedzenia, prosząc zarazem wszystkich pp.Ministrów o nadesłanie w międzyczasie swej opinji o tej sprawie.

16. Przyjęto do wiadomości treść napisu na medalu, jaki min.Aprowizacji zamierza wybić na cześć żywnościowych misji koalicyjnych w Polsce.

17. Przyjęto wniosek Min.Spraw Zagranicznych w sprawie zawarcia z rządem francuskim konwencji w przedmiocie emigracji i imigracji robotników oraz do wystąpienia do Naczelnika Państwa z przedstawieniem o wyznaczenie i upełnomocnienie właściwego Ministra lub Ministrów do podpisania w imieniu Rządu Polskiego pomienionej konwencji. Wykonanie tej uchwały poruczono Min.Spraw Zagranicznych.

18. P.Szef Sekcji Bertoni referuje wniosek Min.Spraw Zagranicznych w sprawie upełnomocnienia Polskiego Czerwonego Krzyża do przeprowadzenia rokowań z sowieckim Czerwonym Krzyżem co do wzajemnego traktowania jeńców oraz zakładników uwięzionych przez rząd sowiecki. Na wniosek p.Prezydenta Ministrów postanowiono zwrócić się do Naczelnego Dowództwa, by ono udzieliło odnośnego upełnomocnienia, gdyż Rząd Polski nie powinien wchodzić w żadne oficjalne stosunki z rządem sowieckim. Wykonanie tej uchwały polecono Min.Spraw Zagranicznych.

19. Przyjęto wniosek p.Ministra Skarbu, by p.Wacława Dzierzgowskiego zwolnić na jego własną prośbę ze stanowiska Naczelnego Dyrektora Podatków i mianować go Naczelnym Inspektorem oraz z zachowaniem posiadanej przez niego IV-ej kat.płacy.

20. Na wniosek p.Ministra Skarbu upoważniono go do zaproszenia p.Ministra Spraw Wojskowych do Rady Gospodarczej.

21. P.Minister Linde porusza sprawę usunięcia biur Min.Pracy i O.S. z gmachu pocztowego, przeznaczonego na pomieszczenie Pocztowej Kasy Oszczędności. P.Podsekretarz Stanu Prystor oświadcza gotowość opróżnienia tego gmachu pod warunkiem, że otrzyma pomieszczenie gdzieindziej. Położenie Min.Pracy i O.S. jest pod tym względem fatalne, gdyż zajmowane przez nie lokale porozrzucane są w różnych częściach miasta i są stanowczo za ciasne. Jedynem rozwiązaniem sprawy byłoby nabycie przez nie własnego gmachu, na co Min.Skarbu wyraziło już swą zgodę, czemu jednak sprzeciwia się stanowczo Najwyższa Izba Kontroli Państwa. W sprawie tej p.Podsekre-

Фрагменты пратакола пасяджэння Савета Міністраў Польшчы адносна неафіцыйных перагавораў у Мікашэвічах. Жнівень 1919 года

НКЗС РСФСР да МЗС Польшчы з прапановай пачаць перагаворы паміж Расійскім і Польскім таварыствамі Чырвонага Крыжа. У гэты ж дзень па ініцыятыве Польскага Бюро ЦК РКП(б) на чале дэлегацыі быў пастаўлены Ю. Мархлеўскі. 4 верасня 1919 года польскі бок выказаўся станоўча наконт прапановы Савецкай Расіі аб пачатку мірных перагавораў. 4 кастрычніка 1919 года НКЗС (а 22 кастрычніка 1919 года і Савет Народных Камісараў РСФСР) упаўнаважыў Ю. Мархлеўскага на вядзенне перагавораў з прадстаўнікамі Польскага Таварыства Чырвонага Крыжа *[5, S. 138]*.

Перад пачаткам мірных перагавораў у Мікашэвічах быў вызначаны склад польскай і савецкай дэлегацый. Польскі бок (ад Польскага Таварыства Чырвонага Крыжа) быў прадстаўлены дэлегацыяй з 10 чалавек на чале з М. Касакоўскім, акрамя таго, у яе ўваходзілі прадстаўнікі Міністэрства ваенных спраў як непасрэдныя ўдзельнікі перагавораў (М. Бірнбаўм, І. Бернер) і як суправаджэнне (С. Сікорскі, А. Бачыньскі). Савецкі бок (дэлегацыя Расійскага Таварыства Чырвонага Крыжа) прадстаўлялі Ю. Мархлеўскі і яго жонка Браніслава (як сакратар), тры эксперты і два кур'еры. Перагаворы па лініі таварыстваў Чырвонага Крыжа пачаліся 10 кастрычніка на польскай тэрыторыі на ст. Мікашэвічы і працягваліся да 22 снежня 1919 года.

Непасрэдна перад пачаткам перагавораў адбыліся сустрэчы польскіх удзельнікаў з Ю. Пілсудскім, на якіх былі атрыманы інструкцыі адносна функцый перагаворшчыкаў. Паводле сцверджання М. Касакоўскага, у яго функцыі ўваходзіла «вядзенне перагавораў з Расійскім Таварыствам Чырвонага Крыжа аб узаемнай дамоўленасці адносна ваеннапалонных, а таксама заложнікаў, захопленых савецкімі ўладамі». М. Бірнбаўму, а пасля І. Бернеру даручалася весці перагаворы аб спыненні ваенных дзеянняў і па іншых палітычных пытаннях.

Сустрэча на чыгуначнай станцыі Мікашэвічы праходзіла ў строгай сакрэтнасці, без складання афіцыйных пратаколаў, шляхам вядзення канфідэнцыяльных размоў паміж удзельнікамі дэлегацый. Такая сакрэтнасць вынікала з агульнай унутрана- і знешнепалітычнай сітуацыі, у якой апынуліся абодва бакі. Пачатак паспяховай наступальнай аперацыі войскаў А. Дзянікіна ў маскоўскім напрамку і на тэрыторыі ўкраінскіх зямель прымушаў Польшчу і РСФСР прымаць экстранныя меры па нармалізацыі свайго становішча. У верасні 1919 года войскі А. Дзянікіна, дзякуючы паспяховаму руху наперад уздоўж заходняга берага Дняпра, падышлі да раёна Гомель – Мазыр – Корасцень і знаходзіліся на стыку з польскім фронтам *[9, с. 183–184]*. Дэлегацыя на чале з генералам А. Карніцкім у другой палове верасня 1919 года накіравалася да вайсковай місіі Дзянікіна з мэтай высветліць яго пазіцыю па занятых польскім бокам усходніх землях, але не дасягнула паразумення адносна сумесных дзеянняў. Нягледзячы на падтрымку Дзянікіна краінамі Антанты, Польшча адмовілася ад каардынацыі сваіх ваенных аперацый з сіламі Добраахвотніцкай арміі, пайшла па шляху перагавораў з Савецкай Расіяй аб часовым перамір'і. У сваю чаргу, савецкае кіраўніцтва пад пагрозай паспяховага наступлення войскаў Дзянікіна вымушана было шукаць магчымасці для канцэнтрацыі савецкіх вайсковых адзінак на Паўднёвым фронце, што прымушала савецкі бок імкнуцца да ўсталявання часовага перамір'я на Заходнім фронце.



Члены місіі Расійскага Таварыства Чырвонага Крыжа на перагаворах у Мікашэвічах. Сядзяць: Юльян і Браніслава Мархлеўскія. Лістапад 1919 года

Падчас сустрэчы ў Мікашэвічах, як і ў час перагавораў у Белавежы, абмеркаванне праходзіла па двух асноўных кірунках: палітычным (часовае спыненне ваенных

дзеянняў) і гуманітарным (вырашэнне праблемы абмену заложнікамі, інтэрніраванымі асобамі). Па першым кірунку польская дэлегацыя праз М. Бірнбаўма распачала дыялог з Ю. Мархлеўскім, падчас якога былі прадэманстраваны пазіцыі бакоў, было дадзена вуснае абяцанне аб прыпыненні наступлення польскіх войскаў на вызначанай ім дэмаркацыйнай лініі. Гэтае рашэнне было ўдакладнена 6 лістапада 1919 года праз прадстаўленне І. Бернерам асноўных пунктаў польскай пазіцыі ў ходзе перагавораў. Прадугледжвалася спыненне ваенных дзеянняў паміж бакамі па лініі фронту (лінія «нямецкіх акопаў»): Ноўгарад-Валынскі (Звягель) – Алеўск (па лініі Сарны – Ковель) – р. Пціч – Бабруйск з апорай на Бярэзіну – Бярэзінскі канал – р. Дзвіна з утварэннем нейтральнай дзесяцікіламетровай зоны *[10, S. 54]*. Уздымаліся пытанні адносна прыналежнасці Дынабурга (Дзвінска), спрэчнага населенага пункта паміж Латвіяй і Савецкай Расіяй, ненападзення на войскі С. Пятлюры, спынення любой агітацыі Савецкай Расіяй у польскім войску, захавання тайны перагавораў. 10 лістапада 1919 года прыведзеныя ўмовы былі паведамлены праз Ю. Мархлеўскага кіраўніцтву Савецкай Расіі з запэўненнем у мірных настроях Польшчы.

На пасяджэнні Палітбюро ЦК РКП(б) 14 лістапада 1919 года было прынята «рашэнне лічыць перададзеныя праз Мархлеўскага ўмовы прымальнымі» *[11, S. 28]*. Але праз два дні палякі атрымалі адказ: савецкі бок карэкціраваў асноўныя пункты польскай пазіцыі. Нязначна была зменена лінія размежавання паміж войскамі ў раёне Бярэзінскага канала на карысць савецкага боку, акрамя гэтага, агаворвалася стварэнне савецкага плацдарма ў раёне р. Бярэзіна – Бабруйск і польскага, памерам на пяць вёрст, на ўсходнім беразе р. Бярэзіны. Пэўным чынам карэкціравалася нейтральная зона, якая павінна была стварацца толькі ў раёне чыгункі Маладзечна – Полацк – Дзвінск памерам на дзесяць вёрст. Прапаноўвалася выключыць пытанне аб Дынабургу для непасрэднага яго вырашэння ў перагаворах з Латвіяй, а таксама зняць патрабаванне адносна Пятлюры. Аб'яўлялася аб адмове ад агітацыі дзяржаўнымі сродкамі, аб захаванні сакрэтнасці. Згодна са сцверджаннем І. Бернера, адказ савецкага боку быў успрыняты Польшчай вельмі негатыўна, прадстаўленыя ўмовы не падлягалі абмеркаванню, лічылася, што гэта быў «акт добрай волі», а «не прадмет гандлю» *[5, S. 104]*.



Члены місіі Польскага Таварыства Чырвонага Крыжа ў вагоне на станцыі Мікашэвічы. Лістапад 1919 года

Польскі бок быў вымушаны скончыць перагаворы, «усе ранейшыя намеры аб стварэнні вызначанай лініі размежавання паміж польскімі і савецкімі войскамі быліануляваны» *[5, S. 234]*. Бернер у сваім дзённіку аргументуе спыненне перагавораў некарэктнымі паводзінамі Савецкай Расіі, якая «жадае любой цаной уцягнуць Начальніка Дзяржавы ў далёка ідучыя перагаворы, нават шляхам заключэння адпаведных дагавораў» *[1, S. 30]*. На самай справе сапраўднай прычынай негатыўнай рэакцыі польскага боку было змяненне агульнай расстаноўкі сіл на Паўднёвым фронце, дзе савецкія войскі перайшлі ў контрнаступленне, значна адцясніўшы войскі Дзянікіна на поўдзень *[9, с. 287–288]*.

Больш супярэчлівым пунктам перагавораў было пытанне абмену заложнікамі, інтэрніраванымі асобамі і іншыя пытанні аб двухбаковым прызнанні правоў таварыстваў Чырвонага Крыжа. На пасяджэнні 23 кастрычніка 1919 года Ю. Мархлеўскі ад імя савецкага ўрада ў Дэкларацыі аб заложніках заявіў аб гатоўнасці адмовіцца на ўзаемнай аснове ад сістэмы заложніцтва, указваючы, «што гэта сістэма была выкарыстана з-за

неахайных адносін польскіх уладаў пры расследаванні справы забойства ў Высока-Мазавецкім павеце ў студзені 1919 года місіі Расійскага Таварыства Чырвонага Крыжа, а таксама як адказ на шматлікія расстрэлы польскімі ваеннымі савецкіх служачых на занятай тэрыторыі» *[12, с. 72]*. Акрамя таго, Ю. Мархлеўскі выказаў гатоўнасць «вырашыць канчаткова, шляхам перагавораў, з прадстаўнікамі Польскага Таварыства Чырвонага Крыжа справы ўсіх польскіх заложнікаў, якія знаходзяцца на тэрыторыі Савецкай Расіі» *[12, с. 72–75]*. Гэтыя заявы сталі асновай для заключэння 2 лістапада 1919 года дагавора. Згодна з ім савецкі бок абавязваўся вызваліць і наладзіць пераход праз дэмаркацыйную лінію (чыгунка Лунінец – Калінкавічы) «грамадзян Польскай Рэспублікі і абласцей, акупіраваных польскімі войскамі, і наогул усіх палякаў, зарэгістраваных і вывезеных у якасці заложнікаў, якія знаходзяцца на тэрыторыі РСФСР» *[12, с. 75–80]*. Іх спісы павінны былі быць сумесна ўзгоднены з прадстаўнікамі Польскага Таварыства Чырвонага Крыжа. Польскі бок па гэтым дагаворы практычна ніякіх абавязкаў на сябе не браў, толькі абмежаваўся заявай «аб невыкарыстанні ў будучыні сістэмы заложніцтва» *[13, с. 11]*.


- Tak jest
- Jeńców wojennych [...] głowa za głowę [...] inwalid [...]?
- Także przyjemnością oddałbym im wszystkich jako dowód lekceważenia, ale to przerazi dygoczącą ze strachu [...]. Zresztą można nieco ich przeszwarcować pod kategorję inwalidów.

Po wyczerpującej rozmowie, wróciłem do domu, by uporządkować myśli.
[...]
istniejących siedzib, przy grasujących już chorobach, które z obozu koncentracyjnego w Brześciu po 300 ludzi tygodniowo porywają.

Фрагмент «Дзённіка» М. Касакоўскага. 1919 год

Паводле дагавора ад 9 лістапада 1919 года, які канкрэтызаваў дагавор ад 2 лістапада, прадстаўнік Расійскага Таварыства Чырвонага Крыжа ад імя ўрада РСФСР і прадстаўнік Польскага Таварыства на падставе сваіх паўнамоцтваў далі абяцанне ажыццявіць абмен цывільных палонных, «арыштаваных або затрыманых урадамі РСФСР ці Польскай Рэспублікі» *[5, S. 214–215]*. Для яго рэалізацыі павінны былі быць складзены спісы: № 1 і № 3, № 5 датычыліся расійскіх цывільных палонных, зняволеных, інтэрніраваных асоб на тэрыторыі Польшчы, а № 2 і № 4 – польскіх цывільных палонных на тэрыторыі Расіі *[10, S. 34]*.

У адпаведнасці з заключаным у Мікашэвічах дагаворам у Заходнім аддзеле НКЗС Расіі былі складзены спісы, у якія былі ўключаны «цывільныя палонныя, палякі па нацыянальнасці і жыхары абласцей, занятых польскімі войскамі і інтэрніраваныя імі, якія падлягалі тэрміновай перадачы Польскай рэспубліцы» *[12, с. 80]*. Спіс № 2 налічваў 113 прозвішчаў, а спіс № 4 складаўся з 1081 прозвішча заложнікаў, цывільных палонных і палякаў з занятых Польшчай абласцей, якія пажадалі вярнуцца на радзіму. Спіс № 1 налічваў 172 прозвішчы ваеннапалонных, якія былі «вывезены з тэрыторыі РСФСР», спіс № 5 – 99 прозвішчаў інтэрніраваных членаў Камуністычнай партыі *[18, с. 80]*.

На пасяджэннях у Мікашэвічах былі дасягнуты некаторыя поспехі ў вырашэнні справы заложнікаў, цывільных палонных і інтэрніраваных асоб. Бакі выпрацавалі праекты дагавораў аб узаемаадносінах таварыстваў Чырвонага Крыжа абедзвюх краін. Уздымалася пытанне аб прыняцці дэкларацыі аб выкананні законаў і звычаяў сухапутнай вайны, аб абмене ваеннапалоннымі, інвалідамі вайны і аб рээміграцыі насельніцтва дзвюх краін. І хоць абмеркаванне мела папярэдні характар, яно ў далейшым было ўлічана на перагаворах, у тым ліку і на мірнай канферэнцыі ў Рызе.

Разыходжанні паміж бакамі ўзніклі падчас вызначэння месца пераходу заложнікаў. Кіраўнік савецкай дэлегацыі выказаў прапанову ажыццявіць непасрэдны абмен заложнікамі (практычнае выкананне дамовы 2 лістапада 1919 года) адразу на трох участках лініі фронту, дзе планавалася спыніць ваенныя дзеянні: Мазыр – Пінск,

Рагачоў – Мінск, Полацк – Маладзечна. Кіраўнік польскай дэлегацыі М. Касакоўскі не выказаўся адкрыта супраць гэтай прапановы, але рэкамендаваў абмежавацца правядзеннем абмену заложнікамі толькі на мазырска-калінкавіцкім участку фронту. Розныя падыходы бакоў адносна гэтага пытання непасрэдна вынікалі са стратэгічных разлікаў палякаў, якія абмяжоўваліся толькі паўднёвым участкам лініі фронту, паколькі там планавалася ажыццявіць вясновае наступленне 1920 года. Пра гэтыя ваенна-стратэгічныя разлікі польскага камандавання Ю. Пілсудскі паведаміў М. Касакоўскаму падчас сустрэчы 13 лістапада 1919 года ў Варшаве. Ю. Пілсудскі раіў не выходзіць за рамкі дамоўленасцей адносна абмену заложнікаў і выказваўся за спыненне любых перагавораў з савецкім бокам *[5, S. 193]*.

Пасля гэтай размовы перагаворы ў Мікашэвічах прадоўжыліся, але агульны сэнс іх змяніўся. Паводле паведамленняў М. Касакоўскага, больш дэталёва пачала разглядацца справа абмену заложнікамі. З 22 лістапада 1919 года пачалося вяртанне заложнікаў на ўчастку фронту ў раёне Лунінец – Калінкавічы, але перайсці праз дэмаркацыйную лінію ўдалося усяго некалькім чалавекам *[5, S. 317]*. Як сцвярджаў М. Касакоўскі, адбыліся сустрэчы з прадстаўнікамі польскага (капітан генеральнага штаба Уладарскі, падпаручнік Рагавінскі) і савецкага (прадстаўнікі РВС Заходняга фронту А. Славінскі, М. Шыманскі) камандаванняў, падчас якіх было вырашана ажыццявіць пераход праз лінію фронту заложнікаў і цывільных палонных *[5, S. 318]*. Гэтае рашэнне было рэалізавана ў раёне барысаўскага ўчастка лініі фронту шляхам непасрэдных сустрэч прадстаўнікоў абодвух камандаванняў у Барысаве 31 снежня 1919 года – 31 студзеня 1920 года *[14]*. У выніку складаных перагавораў былі падпісаны ўмовы часовага спынення ваенных дзеянняў з 2 студзеня 1920 года «з 7 гадзін раніцы на ўчастку, абмежаваным наступнымі лініямі: на поўначы – хутар Целякі – чыгуначная станцыя Прыяміна; на поўдні – чыгуначная станцыя Барысаў – В. Негнавічы – Сморкі», пасля чаго адбыўся абмен двума вагонамі цывільных палонных *[15]*.

Прычыны, асноўны змест, вынікі белавежска-мікашэвіцкіх перагавораў знаходзіліся ў цеснай узаемасувязі з існуючым міжнародным становішчам і ваенна-аператыўнай сітуацыяй. На адзначаным этапе бакі імкнуліся пэўным чынам стабілізаваць сітуацыю на фронце праз часовае спыненне ваенных дзеянняў і ўсталяванне размежавальнай лініі, асноўныя пункты якой знаходзіліся на беларускіх землях. Удзельнікі сустрэч у Белавежы і Мікашэвічах дбалі пра свае інтарэсы, разумелі часовасць дамоўленасцей і не імкнуліся да вырашэння спрэчных момантаў. Белавежска-мікашэвіцкія перагаворы ліпеня, кастрычніка – снежня 1919 года, акрамя надзённых пытанняў абмену заложнікамі, бежанцамі, інтэрніраванымі асобамі, закраналі спектр беларускай праблематыкі, да гэтага часу пакінуты па-за ўвагай даследчыкаў.

## ЛІТАРАТУРА


1. Какурин, Н., Меликов, В. Гражданская война в России: Война с белополяками / Н. Какурин, В. Меликов. – М.: АСТ, 2002. – 732 с.
2. Штейн, Б.Е. «Русский вопрос» на Парижской мирной конференции (1919–1920 гг.) / Б.Е. Штейн. – М.: Госполитиздат, 1949. – 464 с.
3. Ціхаміраў, А.В. Беларусь у сістэме міжнародных адносін перыяду пасляваеннага ўладкавання Еўропы і польска-савецкай вайны (1918–1921 гг.) / А.В. Ціхаміраў. – Мінск: Экаэкспертыза, 2003. – 400 с.
4. Мархлевский, Ю. Польша и мировая революция / Ю. Мархлевский. – М.: Госполитиздат, 1920. – 36 с.
5. Tajne rokowania polsko-radzieckie w 1919 r.: materiały archiwalne i dokumenty / zebrała i oprac. W. Gostyńska. – Warszawa: Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1986. – 414 s.
6. Gostyńska, W. Rola Juliana Marchlewskiego w tajnych rokowaniach polsko-radzieckich (czerwiec – lipiec 1919 r.) / W. Gostyńska // Z pola walki. – 1966. – № 2. – S. 23–41.
7. Pobóg-Malinowski, W. Najnowsza historia polityczna Polski. 1864–1945: w 3 t. / W. Pobóg-Malinowski. – Paryż – Londyn, 1953–1960. – T. 1: 1914–1939. – 1956. – 687 s.
8. Будберг, А. Дневник белогвардейца / А. Будберг. – М.: Прибой, 1929. – 178 с.
9. Гражданская война и военная интервенция в СССР: энциклопедия / под ред. С.С. Хромова. – М.: Советская энциклопедия, 1993. – 702 с.
10. Sieradzki, J. Białowieża i Mikaszewicze, mity i prawdy. Do genezy wojny pomiędzy Polską a RSFrR w 1920 r. / J. Sieradzki. – Warszawa: Wydawnictwo Ministerstwa obrony Narodnej, 1959. – 115 s.
11. Kutrzeba, S. Wprawa kijowska 1920 roku / S. Kutrzeba. – Warszawa, 1937. – 156 s.
12. «Красная книга»: сборник дипломатических документов о русско-польских отношениях 1918–1920 гг. – М.: Госполитиздат, 1920. – 112 с.
13. Райский, Н.С. Польско-советская война 1919–1920 годов и судьба военнопленных, интернированных, заложников и беженцев / Н.С. Райский // Новая и новейшая история. – 1995. – № 3. – С. 2–40.
14. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 8. – Воп. 1. – Спр. 7. – Л. 23.
15. НАРБ. – Ф. 4п. – Воп. 1. – Спр. 316. – Л. 87.